**УДК 37.013:7.01**

# МЕТАДЫ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ (КАНЕЦ ХІХ – ПАЧАТАК ХХ СТАГОДДЗЯ)

***С.Р. ТУБОЛЕЦ***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Аналізуецца рэалізацыя метадаў эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення (ад нараджэння да 20-гадовага ўзросту) у беларускай народнай педагогіцы.*

*Шэраг традыцыйных метадаў народнай педагогікі (праца, назіранне, гульня, прывучэнне, расказванне, прыклад і аўтарытэт і г.д.) маюць спецыфічнасць выкарыстання на падставе адвечных сродкаў выхавання (праца, родная мова, народная творчасць (найперш фальклор), гульні, традыцыі, звычаі, святы, абрады) у розныя ўзроставыя перыяды. У маленстве праз метады назірання, унушэння, растлумачэння, перакананне ідзе фарміраванне непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці. Дзяцінства адметна метадамі эстэтычнага выхавання, што скіраваны на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. З дапамогай метадаў працы, гульні, расповеда, гутаркі дзеці прывучаюцца рабіць усё, крытэрый якасці – прыгажосць. Падлеткавы ўзрост аб'ядноўвае папярэдні і наступны перыяды, характарызуецца пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. Юнацтва – час арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая ідзе праз працу, святы, абрады, традыцыі.*

**Уводзіны.** Праблема эстэтычнага выхавання асобы актуальная ва ўсе часы. Сучасныя характарыстыкі грамадства, у якім на працягу жыцця аднаго пакалення ідуць значныя змены ў сацыяльным, палітычным, культурным жыцці, актуалізуюць пошукі трывалага падмурку, які дазволіў бы аб'яднаць людзей, вылучыць агульныя каштоўнасці і накірункі, якія дазваляюць не парываць пераемнасць паміж бацькамі і дзецьмі, продкамі і нашчадкамі. Акцэнт увагі на адраджэнні традыцыйнага эстэтычнага выхавання дазваляе наблізіцца да вырашэння гэтага складанага пытання.

Наша краіна мае шэраг законаў, праграм, канцэпцый, што пабудаваны на этнакультурным падмурку, арыентаваны на выкарыстанне мясцовых умоў, выхаваўчых магчымасцей, мясцовых традыцый («Закон аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» (1991), «Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Беларусі» (1992), «Закон Рэспублікі Беларусь аб агульнай сярэдняй адукацыі» (2006), «Праграма развіцця агульнай сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на 2007 – 2016 гады», «Непарыўнае выхаванне дзяцей і навучэнцаў у Рэспубліцы Беларусь: Канцэпцыя і праграма на 2006 – 2010 гады» і г.д.). Яны ўдзяляюць увагу традыцыйнаму выхаванню, ставяць задачу звярнуцца да традыцый народнай спадчыны ў выхаванні, эстэтычным у прыватнасці.

Вядучыя педагогі, мастацтвазнаўцы, этнографы збіраюць, вывучаюць і прапагандуюць матэрыялы народнай творчасці і народнай педагогікі. Трэба адзначыць функцыянаванне музеяў этнаграфіі і фальклору, народнай творчасці. Так, сістэма адукацыі скіравана на пошук новых шляхоў, метадаў выхавання (у тым ліку і эстэтычнага) з мэтай адраджэння нацыянальнага самаразумення, далучэння да свайго этнасу. Аднак не прадбачыцца цэласнай сістэмы эстэтычнага выхавання, заснаванай на этнакультурных традыцыях народа, што абумоўлена недастатковай увагай да традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, да пашыранасці і рэалізацыі метадаў народнай педагогіцы ў эстэтычным выхаванні беларусаў.

Асаблівасці стану эстэтычнага выхавання моладзі (уплыў прадукцыі масавай культуры, увага да дэструктыўных мастацкіх накірункаў, змяшэнне эстэтычных і маральных катэгорый прыгожага і агіднага, добрага і агрэсіўнага і г.д.) сведчуць аб яго крызісным стане і патрабуюць звароту да механізмаў захавання і развіцця, правераных часам. Між тым традыцыі народнай педагогікі беларусаў паказваюць напрамкі руху да паляпшэння выхаваўчай сітуацыі ў галіне эстэтычнага выхавання, скіроўваюць увагу на далучэнне да эстэтычных здабыткаў праз адвечную народна-педагагічную скарбніцу, праз традыцыйныя метады.

Айчынныя і замежныя этнапедагогі (Г.Н. Волкаў, Г.П. Арлова, В.Н. Болбас, А.Л. Міхайлава) акцэнтуюць увагу на невычэрпальныя патэнцыяльныя магчымасці для выкарыстання назапашанага практычнага вопыту, традыцый, сродкаў, метадаў у сучаснай выхаваўчай сістэме. Ва ўсе часы народная педагогіка мела на ўвазе выхаванне гарманічнай асобы, асаблівасць якой – разуменне добрага як прыгожага. Усё гэта патрабуе звароту менавіта да традыцыйных метадаў эстэтычнага выхавання, да найбольш канцэнтраванага, цэласнага ўяўлення праз метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Важнасць звароту да гістарычнага перыяду ХІХ – пачатку ХХ стагоддзяў абумоўлена найбольшым росквітам традыцыйнасці, бо масавая урбанізацыя яшчэ не закранула сялянства. Народная педагогіка, што вырасла на этнічнай глебе, паўстае ва ўсёй плыні свайго багацця. Гэты перыяд каштоўны тым, што сваю

навукова-даследчую актыўнасць у накірунку вывучэння народнай педагагічнай спадчыны праявіла пляяда этнографаў, педагогаў, гісторыкаў, сярод якіх: М.В. Доўнар-Запольскі, Я.Ф. Карскі, Ю.Ф. Крачкоўскі, М.Я. Нікіфароўскі, Е.Р. Раманаў, П.В. Шэйн. Сёння сістэматызацыя ведаў у галіне народнага выхавання дазваляе абагуліць цэласныя ўяўленні аб духоўным багацці, што захавана продкамі, дае магчымасць паспяховай рэалізацыі назапашанага народнага вопыту ў сучаснай дзейнасці, у новых гістарычных умовах, якія характарызуюцца паступовым ростам увагі да нацыянальнага, гістарычнага, асабовага, што разглядаецца перадумовай станоўчага і якасна выніковага развіцця асобы.

**Матэрыял і метады.** Аб’ект даследавання – беларуская народная педагогіка. Прадмет даследавання – метады эстэтычнага выхавання беларускай народнай педагогікі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Даследаванне выканана з выкарыстаннем комплексу ўзаемадапаўняльных метадаў: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, а таксама гісторыка-педагагічнага аналізу, навукова-даследчых прыёмаў (інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя і класіфікацыя).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Беларуская народная педагогіка захавала традыцыйны падыход да вырашэння праблемы эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення. Аналіз матэрыялаў фальклору, этнаграфічных, гісторыка-педагагічных прац дае падставу казаць аб тым, што традыцыйнае выкарыстанне метадаў эстэтычнага выхавання мае свае этнічныя асаблівасці, што звязана з уяўленнямі аб вобразе дасканалай асобы.

Шэраг традыцыйных метадаў народнай педагогікі (праца, назіранне, гульня, прывучэнне, расказванне, прыклад і аўтарытэт і г.д.) мае спецыфічнасць выкарыстання на падставе адвечных сродкаў выхавання (праца, родная мова, народная творчасць (найперш фальклор), гульні, традыцыі, звычаі, святы, абрады) у розныя ўзроставыя перыяды.

Узроставая перыядызацыя ў беларускай народнай педагогіцы адрозніваецца ад прынятай у сучасных псіхолага-педагагічных даследаваннях. Мы прытрымліваемся пазіцыі Г.П. Арловай [1], Л.В. Ракавай [2], якія выдзяляюць у дзяцінстве ў адпаведнасці з традыцыямі і народнымі поглядамі «чатыры ўзроставыя ступені: маленства – ад нараджэння да 6 – 8 гадоў (узроставыя падгрупы «анёлкаў» ад 0 да 2 – 3 год і «блазнюкоў» – ад 2 – 3 да 6 – 8 гадоў); дзяцінства – ад 6 – 8 да 12 – 14 гадоў; падлеткавы ўзрост – ад 12 – 14 да 16 – 17 гадоў і юнацтва – ад 16 – 17 да 18 – 20 гадоў. Кожнай з іх адпавядалі змены ў біялагічным развіцці дзіцяці, пэўныя абавязкі дзяцей у сям’і і грамадстве, адносіны бацькоў да дзяцей розных узростаў, адносіны да іх іншых членаў сям’і і грамадства» [3, 10]. У пэўным узроставым перыядзе прэвалююць тыя ці іншыя метады эстэтычнага выхавання, скіраваныя на фарміраванне адпаведна непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычных перажыванняў, эстэтычных густаў, ацэнак, арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці. Інакш кажучы, мы бачым прыярытэтную скіраванасць тых ці іншых метадаў у розныя ўзроставыя адрэзкі, што адлюстравана ў табліцы.

**Прыярытэтная скіраванасць у розныя ўзроставыя адрэзкі**

| № п/п | Гады жыцця | Назва перыяду | Падраздзелы перыяду | Метыды эстэтычнага выхавання | Этапы эстэтычнага развіцця |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 0 – 6 – 8 | Маленства | «Анёлкі» 0 – 2 – 3 | Назіранне, растлумачэнне, перакананне | Фарміраванне непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці |
| | | | «Блазнюкі» 2 – 3 – 6 – 8 | Гульні, назіранні, праца | |
| 2. | ад 6 – 8 да 12 – 14 | Дзяцінства | Дзеці | Праца, перакананне, гутарка, назіранне, унушэнне, прыклад, ухваленне, заахвочванне, высмейванне, асуджэнне | Фарміраванне эстэтычных перажыванняў, густаў, ацэнак |
| 3. | Падлеткавы ўзрост: ад 12 – 14 да 16 – 17 | Падлеткі | | Праца, перакананне, гутарка, назіранне, унушэнне, прыклад, ухваленне, заахвочванне, высмейванне, асуджэнне, абрады, святы, пасядзелкі, вячоркі, супарадкі, ігрышчы | |
| 4. | Юнацтва ад 16 – 17 да 18 – 20 | Моладзь | | Праца, абрады, святы, пасядзелкі, вячоркі, супарадкі, ігрышчы | Арганізацыя эстэтычна значнай практычнай дзейнасці |

Згодна з прапанаваным падыходам да ўзроставай перыядызацыі разгледзім **метады фарміравання непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці ў маленстве, ва ўзроставых падгрупах «анёлкаў» і «блазнюкоў»**. Гэта метады назірання, растлумачэння, перакананння, якія знаходзяць найбольшае выражэнне ў дзіцячым фальклоры.

Калыханкі першымі эстэтычна знаёмяць з жывёламі і птушкамі, іх маляўнічымі апісаннямі, учынкамі, прыгодамі. Праз калыханкі ідзе перакананне ў іх карыснасці і прыгажосці, прывучэнне да добрых адносін, да жывой прыроды, назірання за ёю. Улюбёныя фальклорныя персанажы твораў: кот (лічылася, што ён можа перадаць свае звычкі дзіцяці), голуб (сімвал чысціні, лагоднасці, прыгожых чалавечых якасцей), курыная сямейка (сімвал клапатлівасці і ўтульнасці): *// Пайдзі, коця, на вулку, // А дзіця ў люльку. // На ката варкота, // А на дзіця дрымота...* [4, с. 615].

Даследчыкі гавораць аб своеасаблівай «школе пешчання маленькіх, якія яшчэ толькі пачынаюць развівацца, фарміравацца, і ў іх зараджаецца асэнсаванае разуменне» [5, с. 13]. Добрыя звычаі, якія якраз замацоўваюцца ў гэтым узросце, лепш за ўсё фарміруюцца праз назіранні шляхам пераймання. У многім спрыяе гэтаму само жыццё, дзе кожны дзень дзіця з'яўляецца непасрэдным эмацыйным удзельнікам пэўных сітуацый, па-свойму ўспрымае і засвойвае іх.

«“Школа пешчання” ўдасканальвала вобразнае мысленне і была першай школай музычнай адукацыі. У беларусаў склалася найбагацейшая песенная культура з вялікай разнастайнасцю калыханак, якія добра ведала кожная сялянка, дзякуючы трансмісіі народнага вопыту з пакалення ў пакаленне» [3]. З ростам дзіцяці паступова ўскладняюцца песні маці. Яны пачынаюць распавядаць пра ідэальныя ўяўленні народа аб шчасці, прасякнуты жыццёвай мудрасцю. З нараджэння, слухаючы калыханкі, лічылкі, забаўлянкі, казкі, атрымліваюць дзеці першыя ўрокі эстэтыкі: прывучаюцца да мілагучнасці роднай мовы, адзначаюць яе рытм, рыфмы, пявучасць, паступова авалодваюць эстэтычным поглядам на жыццё. Калыханкі, а разам з імі пацешкі, забаўлянкі і лічылкі не толькі прыгожыя, але і багатыя ў рытмагукавых адносінах. У залежнасці ад жанру твора рытм мяняецца з павольнага і закалыхваючага ў калыханках да хуткага, арганізуючага ў забаўлянках і лічылках: *// Раз, два, тры, чатыры, // Кошку грамаце вучылі: // Не чытаць, не пісаць, // А за мышкамі скакаць* [4, с. 626].

Лічылкі маюць выразны, яскравы рытм, які надае магчымасць не проста прагаворваць тэкст, а выразна амаль што крычаць, а гэта прыносіць дзецям асаблівае задавальненне. Кожны вершык мае сваё гучанне, памер. Дзеці прывучаюцца адчуваць і падсвядома асэнсоўваць гэтыя якасці твораў у гульні.

Дзіцячы фальклор мае на мэце весяліць малых, бадзёрыць, ён дае ўрокі маральнасці, эстэтычнага светаўспрыняцця. З заклічкамі, кароценькімі вершыкамі, песенькамі пасталелыя дзеці эмацыйна звяртаюцца да сонца і дажджу, вясёлкі і ветру. Гэта свайго роду ўводзіны ў сістэму музыкальных жанраў. Пры слуханні ці выкананні простага напеву дзеці вучацца адрозніваць танальнасць слоў, інтанацыю, авалодваюць зместам песенек: // *Сонейка, сонца, // Выглянь ў аконца. // Пасвяці нам трошку, // Дам табе гарошку* [4, с. 622].

Развіваецца эстэтычная ўспрымальнасць, дзеці вучацца адчуваць рытм, гармонію. Вобразы з'яў прыроды клічуць не проста глядзець, але і бачыць, не толькі слухаць, але і чуць. Ідзе назапашванне эстэтычных ураженняў ад прыродных і моўных з'яў, наваколля, прыгожых чалавечых праяў. Гармонія і мэтанакіраванасць вядуць дзяцей да пошуку эстэтычага ва ўсёй рэчаіснасці. Свет апісваецца эмацыянальна, увага накіроўваецца ў пачуццёва-эстэтычны бок, таму перад вачыма паўстае не адзінкавы прадмет, а паэтычна-завершаны вобраз. Эмацыйным зносінам са старэйшымі спрыяюць разнастайныя выявы жывых і нежывых аб'ектаў, адлюстраваныя ў дзіцячым фальклоры. Даволі часта яны ствараюць малому настрой, бо родная мова садзейнічае ўзнікненню і змяненню пачуццяў, што адлюстроўваюць псіхічны стан асобы, які звязаны з уздзеяннем слова, рытму. Такім чынам, выкарыстанне сродкаў моўнай выразнасці дапамагае працэсу эстэтычнага выхавання.

У жыццё «блазнюкоў» уваходзяць гульні, прыкладам для з'яўлення якіх становіцца працоўная дзейнасць. Першыя гульні будуюцца на аснове назіранняў. Абагульненыя вобразы свойскіх жывёл (бульба з пруткамі ўвасабляе кароў, коней, свіней), чалавека (саламяная лялька) даюць прастору для ўласнай дзіцячай фантазіі, творчасці, пошуку эстэтычных вырашэнняў. Потым надыходзіць чарга гульняў з дзецьмі. «Да дзеда ў госці», «У мак», «Воўк і авечкі», «А мы проса сеялі», «Рэдзька», «Мікіта», «Лянок або Лён» [6] і іншыя з вялікай падрабязнасцю адлюстроўваюць працоўныя працэсы, рыхтуюць да іх дзяцей, выклікаюць жаданне ўзяцца за сапраўдную справу – і ўсё гэта ахутана эстэтычна прыўзнятым настроем. Дзіця ў гульні атрымоўвае станоўчыя эмоцыі ад выканання ва ўмоўнай форме дзеянняў, якія ў рэальным жыцці пакуль што немагчымы. Гэта дазваляе зведаць розныя пачуцці, атрымаць значнае эмацыянальнае ўзрушэнне, задавальненне, эстэтычнае перажыванне. Для гульні бяруць падзеі звычайнага жыцця, але прапушчаныя праз прызму эстэтычнага ўспрыняцця. Чалавек свабодна выбірае від дзейнасці, што садзейнічае задавальненню патрэбнасцей у прыемнасці, дае пачуццё радасці. Гульні («У рыбу», «Стралец», «Клубок», «Лянок») адлюстроўваюць спрадвечныя клопаты аб дабрабыце сям'і, славяць чалавека працы, вучаць быць уважлівымі да прыгажосці свету.

Прывучаць дзяцей да працы, згодна традыцыям беларускай народнай педагогікі, пачыналі з пяцігадовага ўзросту. Са сталеннем працоўныя заданні набіраюць ёмістасць і складанасць. Нязменнымі застаюцца крытэрыі іх адзнакі – якасць і прыгажосць. У працоўных аперацыях развіваецца мысленне, а ста-

ранне зрабіць добрую, прыгожую, якасную рэч, нараджае эстэтычныя пачуцці і замацоўвае эстэтычныя густы. На падставе сфарміраванага непасрэднага пачуццёвага адбіцця рэчаіснасці пачынаецца фарміраванне эстэтычных перажыванняў. Часовыя межы этапа пачынаюцца ў дзяцінстве і доўжацца да юнацтва.

Другі ўзроставы этап – **дзяцінства – ад 6 да 12 – 14 год.** На падставе сфарміраванага непасрэднага пачуццёвага адбіцця рэчаіснасці пачынаецца актыўнае фарміраванне эстэтычных перажыванняў, густаў, ацэнак. Гэта доўжыцца амаль да юнацтва.

Актыўнае прывучэнне дзяцей да працы ідзе свядома з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей не толькі ў гульнёвай, але і ў сапраўднай працоўнай дзейнасці. Як мага раней хлопчыкі і дзяўчынкі далучаюцца да сялянскіх і хатніх спраў, нават калі дарослыя не вельмі адчуваюць патрэбу ў іх дапамозе. Адпаведна з прынцыпам народнай педагогікі, дзеці ўмеюць рабіць і робяць усё. Таму дзеці і выконваюць разнастайныя заданні, адным з крытэрыяў выканання якіх з’яўляецца прыгажосць – усё вызначаецца гэтай меркай.

У далучэнні дзяцей да работ станоўчую ролю адыгрываюць казкі, што паэтызуюць жыццё і працу. Гэта той эстэтызуючы арыенцір, які накіроўвае думкі хлопчыкаў і дзяўчынак на карысную дзейнасць, бо амаль кожны казачны герой – птушка, звер, чалавек – найчасцей паказваецца праз прызму працоўных спраў. Эстэтычныя пачуцці ўзнікаюць дзякуючы мастацкай выразнасці, завершанасці твора, суаднosін дзеянняў герояў эстэтычнаму ідэалу грамадства. Казкі прапануюць эстэтычна падмацаваны прыклад, якім быць. Ён падтрымліваецца аўтарытэтам бацькоў, родных, якія ўвесь час старанна працуюць.

Добрая праца ўзвялічвае, набліжае да народнага эстэтычнага ідэалу таго, хто яе рабіў. Казкі садзейнічаюць стварэнню ў слухачоў станоўчых эмацыйна-каштоўнасных адносін да працы, пераконваюць у яе неабходнасці. Праца і толькі праца дае чалавеку дабрабыт, пашану, духоўную раўнавагу, эстэтычнае задавальненне. Як прыклад – казка «Крадзеным сыты не будзеш». Першы сын у пабудаванай бацькам кузні займаецца кавальствам: «*І людзі хваляць яго, і сам ён сваёй працай задаволены*» [7, с. 390]. Малодшы сын вырашыў красці, аднак бацька здолеў даць яму нагляднЫ ўрок, што «крадзеным… сыты не будзеш». Гэты ўрок замацаваны нават вонкавым карыкатурна гіпербалізаваным змяненнем знешнасці бацькі і сына. Эстэтычны ідэал народа патрабуе для прыгожага чалавека добрага здароўя, што выражаецца ў фізічнай моцы: «*У бацькі шыя ў два разы патаўсцела, у сына – у два разы пахудзела*» [7, с. 391].

Эстэтычную перавагу беларус заўжды аддае працаўніку. Гэта можа выражацца ў тым, што фантазія казачніка вымушае героя выконваць шмат работ (найчасцей сялянскіх) за надзвычай кароткі час. За добрае сэрца (бачым яднанне этычнага і эстэтычнага) яму дапамагаюць незвычайныя памочнікі (торбачка, рушнічок, люлька, мышка і г.д.). Працаўнікоў народ надзяляе прыгажосцю, дае вялікую ўзнагароду ў выглядзе багацця ці ўдалага шлюбу, а іх антыподы атрымліваюць знешнія заганы, а часам і смерць. У казцы «Сірата» [8, с. 223] працаўніца надзяляецца дарам: калі плача – з вачэй перлы сыплюцца, а замуж яна выходзіць за цара. Лянівая ж і нядобрая яе сястра пакарана тым, што калі «смяецца – сыплюцца жабы», а ў рэшце рэшт ёй сякуць галаву.

Эстэтычная і практычна значная ўзнагарода чалавека падкрэслівае думку, што ён абавязкова знойдзе сваё шчасце, замацоўвае яго высокае месца ў сістэме каштоўнасцей. Чароўныя казкі прапускаюць праз прызму эстэтычнага светаўспрыняцця жыццёвыя з’явы, народныя жаданні, бездакорліва арганічна спалучаюць разнародныя несумяшчальныя ў звычайным жыцці элементы. Разам з чалавекам у гэтых творах дзейнічае персаніфікаваная прырода – Сонца, Змей, Мароз. Думка аб перамозе дабра над злом, прыгожага над агідным сцвярджаецца ў чароўных казках і ўнушаецца чалавеку. Гэтыя мудрыя творы нясуць стымулюючае эмацыянальнае ўздзеянне, выклікаюць жаданне шукаць і знаходзіць эстэтычнае ў сапраўдным жыцці.

У сацыяльна-бытавых казках, што вучаць дзелавым паводзінам, сямейным адносінам, праслаўляюцца, становяцца прыкладам працавітасць, сціпласць простага чалавека, які выступае своеасаблівым эстэтычным ідэалам. Адначасова высмейваецца і асуджаецца зайздрасць, гультайства і іншыя чалавечыя заганы і недахопы. І хаця ўвогуле казкі прасякнуты добрым гумарам, жартам, там, дзе намаляваны агідны твар прыгнятальнікаў працоўнага народа, гумар пераходзіць у сатыру, унушае ўсімі даступнымі мастацкімі сродкамі непрыняцце антыгероя.

Моц беларускай народнай казкі ў сцвярджэнні праўды, дабра і прыгажосці, развянчанні зла. Менавіта ў гэтым мы бачым падмурак яе маральна-эстэтычнага сэнсу. Казкі беларускага народа з’яўляюцца выдатным матэрыялам для выхавання пачуццяў, развіцця фантазіі, фарміравання эстэтычных адносін да рэчаіснасці.

Такім чынам, у гутарках, гульнях, працы фарміруюцца эстэтычныя перажыванні. Кожны жадае атаясамліваць сябе з легендарным героем ці майстрам, паказаць казачныя спрыт і ўменні. Дарослыя абапіраюцца на гэтыя дзіцячыя асаблівасці, фарміруюць праз іх імкненне да прыгажосці.

Зыходзячы з цікаўнасці дзетак да свету, рэчаіснасці, ім прапануецца вялікае кола загадак, у многім пабудаваных на эстэтычным светаўспрыняцці. Загадкі – неад’емны атрыбут гутарак, казак, гульняў, яны

ўзніклі з працоўнага вопыту і нясуць водбліск замілавання чалавека сваімі дзеяннямі і іх вынікамі. Загадкі ўзбуджаюць фантазію, выклікаюць эстэтычныя перажыванні. Трэба быць назіральным, мець пачуццё гумару, каб адгадаць, што за *«цар ходзіць па гародзе, носіць два бліны ў бародзе, а трэці на галаве»* /певень/. Прыгожая форма загадак, пабудаваных на супрацьлеглых спалучэннях: *«Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне?»* /воск/, *«Рота няма, а зубы маюцца»* /граблі/ [4], дае штуршок да пільнай увагі да рэчаіснасці, мовы. Кожная загадка настолькі насычана паэтычнымі вобразамі, што яе можна назваць паэзіяй у чыстым выглядзе. Яны, як ні адзін іншы жанр вуснай народнай творчасці, уводзяць у свет паэзіі чалавека. Менавіта эстэтычная ўстаноўка загадкі самая галоўная, яна адчыняе чалавеку вочы на паэзію самаробных рэчаў, на паэтычнае ў працы, прыродных аб'ектах.

Дзеці любяць загадкі, вобразы якіх узяты са з'яў і прадметаў прыроды, блізкіх і знаёмых. Менавіта гэта робіць іх жывымі істотамі, выклікае эмацыянальную рэакцыю: прымушае здзіўляцца, захапляцца, параўноўваць загадкавае з добра знаёмым, заўважаць смешнае: *«Ляцелі сівыя галубкі, упалі на ваду, вады не скалацілі і самі не патанулі»* (снег). У народных загадках прырода ачалавечваецца. Вада – *«без ног бяжыць, без воч глядзіць»*, морква параўноўваецца з царыцай (*«У цямніцы сядзіць царыца, косы на дварэ»*), раса – з ключамі паненкі (*«Ішла паненка ўначы, пагубіла ключы»* [4]).

Даследчыкі беларускай загадкі знаходзяць іх роднасную сувязь з прымаўкамі. У прыватнасці, адзначаецца, што загадка, страціўшы сваё канкрэтнае значэнне і набыўшы сэнс пераноснасці, алегарычнасці, становіцца прымаўкай, і наадварот [9]. Магчыма таму карыстаюцца вялікай папулярнасцю і з'яўляюцца значным і дзейсным сродкам эстэтычнага выхавання беларускія народныя прыказкі і прымаўкі. Яны нясуць адвечную неўміручую жыццёвую мудрасць, поўную мастацкай красы, абаяльнасці, гумарыстычнага зместу.

Паколькі цэнтральнае месца ў прыказках і прымаўках займае чалавек з яго вартасцямі, то ўсё добрае, прыгожае, высакароднае ўхваляецца, заахвочваецца, паказваецца грамадскай думкай як прыклад, які павінен стаць нормай, а адмоўнае высмейваецца і асуджаецца: *«Адвага гарады бярэ»*, *«Вока бачыць далёка, а чалавек яшчэ далей»*,*»Не давай волі рукам: гэтая воля завядзе ў няволю»* [10; 11].

Прыказкі карысныя не толькі тым, пра што ў іх гаворыцца. Яны валодаюць прыгожай мастацкай формай, разнастайнымі і дасканалымі выяўленчымі сродкамі моўнай афарбоўкі, якія адпавядаюць глыбіні іх думкі і мудрасці. У прыказках і прымаўках шырока выкарыстоўваюцца: гіпербала – *«Такая зямля добрая – пасадзі аглоблі – калёсы вырастуць»*; параўнанне – *«Гавораць, як у бубен б'юць»*; метафара – *«Рамяство піць і есці не просіць, а само корміць»*; іронія – *«Гляне – малако кісне»*. Асуджаюцца розныя неэстэтычныя заганныя рысы: дурасць, лянота, скупасць, п'янства: *«Скажы дурному паклоны біць, то ён і лоб разаб'е»*; *«Яму ўранку росна, удзень – млосна, а вечарам – камары заядаюць»*; *«Скупому рубель даражэйшы за душу»*, ілжывасць: *«Праўду пахаваеш, і сам з ямы не вылезеш»*; *«Гарэлкай розуму не прамыеш»* [11; 12]. Народныя прыказкі і прымаўкі дапамагаюць прывіццю эстэтычнай ацэнкі рэчаіснасці, садзейнічаюць станаўленню эстэтычнага густу. Выслоўе «Сцісласць – сястра таленту» знаходзіць у іх сваё пацвярджэнне. Слоў мала, а думак, вобразаў – шмат. Можна казаць аб некалькіх узроўнях разумення адной і той жа прымаўкі. Першы ўзровень – калі дзіця, чалавек бачыць, разумее прамы сэнс сказанага. Другі, больш высокі, калі адбываецца своеасаблівы перанос паняццяў, пераход ад канкрэтыкі да абагульнення.

**Падлеткавы ўзрост – ад 12 – 14 да 16 – 17 гадоў** з'яўляецца адзіным ланцужком у пераемнай сувязі паміж маленствам – дзяцінствам – юнацтвам. Дадзены ўзрост характарызуецца паступовым пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў, густаў, ацэнак да арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, з выкарыстаннем метадаў, што знаходзяць прымяненне як на этапе фарміравання эстэтычных перажыванняў, так і арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці.

Нарэшце, чацвёрты ўзроставы перыяд, **юнацтва**, мае ўмоўныя межы з **16 – 17 да 19 – 20 гадоў.** У гэты час юнакі і дзяўчаты ўжо валодаюць неабходнымі ўменнямі і навыкамі, стаяць на парозе самастойнага жыцця, рыхтуюцца стварыць сям'ю. Настае пара, якую мы назвалі «арганізацыяй эстэтычна значнай практычнай дзейнасці». Зразумела, галоўны метад – праца. Чалавек, здольны да працоўнай дасканаласці, да сяброўства, – эстэтычны ідэал беларускага народа. Ён дае дзецям прыклад паводзін у жыцці і ў працы. Акрамя таго, са штодзённай рэчаіснасці вядома, што ў вёсцы паважаюць толькі працаўнікоў, майстроў сваёй справы. Праца разглядаецца не толькі як сродак задавальнення матэрыяльных патрэб, але і як сродак маральнасці, эстэтычнасці, шчасця. Гэта сцвярджаецца і апорай вясельнай абраднасці на працу, уключэнне ў эстэтычны ідэал шматлікіх працоўных навыкаў. Пры выбары нявесты раяць: *«Дзеўка не бракоўна, як чорна, а бракоўна як не праворна»* [4]. Дзяўчыне давалі наступную параду *«З добрым гаспадаром – нажывешся, а з ліхім – гора набярэшся»*. Народная мудрасць адзначае непарыўную сувязь паміж працай, актыўнай дзейнасцю чалавека і прыгажосцю, гаворыць аб тым, што прыгажосць чалавека без працоўных уменняў не мае сэнсу: *«Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, хто на справу гож»*. Толькі працаўніца магла быць названа прыгажуняй, лянівіцу ж народ так і зваў – гультайкай: *«У няўмекі рукі – калекі»*. Падкрэсліваецца значнасць, прыгажосць таго, хто працуе,

як ён гэта робіць: «*Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста*», «*Хто рана ўстаў, таму Бог дае*» [11; 12]. Праца, актыўная дзейнасць і прыгажосць чалавека цесна звязаны ў народным разуменні: «*Хоць памалу, але добра*». Народам выпрацавана ўяўленне аб тым, што самі адносіны да працы павінны быць эстэтычнымі. Гэта азначае ўменне бачыць сэнс у рабоце, імкненне выканаць яе хутка, прыгожа, якасна, ужываць спрытныя эстэтычныя працоўныя рухі. «*Хто працуе, той святкуе*», «*Хто ў рабоце не лянівы, той у жыцці шчаслівы*». Чалавечая вартасць вымяраецца працаздольнасцю, якасцю працы: «*Якую робіш справу, такую маеш і славу*», «*Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства*» [11; 12].

Прыгажосць працы – гэта высокая якасць у адзінстве з карыснасцю прадукта працы на аснове фантазіі і творчасці. Можна сказаць, што любая творчасць ёсць праца, аднак адваротнае верна не заўжды. Народная педагогіка ставіць сваёй мэтай навучыць моладзь бачыць прыгажосць ва ўсіх праявах: у працэсе, прадукце працы, чалавечых адносінах да яе: «*Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць*», «*Чалавек жыве век, а добрае дзела – два*» [11; 12]. Чалавек можа сябе ўдасканаліць, калі будзе займацца творчай працай, дабівацца гармоніі як сіл, так і магчымасцей. Для народа праца не толькі жыццёвая неабходнасць, але галіна духоўнага жыцця і крыніца багацця асобы. Менавіта таму ў календары беларусаў шмат святочных дзён, прычым у большасці яны звязваюцца з працоўнымі падзеямі: пачаткам севу, выганам скаціны ў поле, зажынкамі і г.д. Ва ўсіх іх прымаюць актыўны ўдзел юнакі і дзяўчаты. Чалавек мае магчымасць свабоднай творчасці, можа праявіць сваё майстэрства, уменне. Ёсць падстава сцвярджаць, што тлумачэнне селянінам рэчаіснасці грунтуецца на эстэтыка-рамантычным падыходзе, бо эмацыянальны, маральны бакі пераважаюць, уладараць над жыццёвымі рэаліямі. Творчасць беларусаў, чаго б яна ні датычылася, скіравана да праблем прыгажосці, дабрыні, міласэрнасці, справядлівасці.

Напрыклад, да зажынкаў старанна рыхтуюцца: прыбіраюць у хаце, пякуць хлеб, збіраюць невялікае частаванне. Першы сноп звычайна жне найбольш спрытная маладая жанчына ў прысутнасці дзяўчат, накідвае на яго ручнік, і ўсе разам нясуць гэты імянны сноп з песнямі на гумно, з яго ж пачынаюць малацьбу. Імяннное зерне складае частку новага пасеву. Абрады з дажыначным снапом-дзедам ці снапом-бабай нясуць імкненне выклікаць добры ўраджай наступнага году, узвысіць найлепшых працаўнікоў, якія пачынаюць абрады. Сноп надзяляецца жыватворнай сілай, увасабляе сабой багацце, пераемнасць, дабрабыт. Снапы неслі ў хаты да хворых, цяжарных жанчын, да маладух. У хаце снапу вызначалася пачэснае месца – чырвоны кут [13].

Шмат свят прымеркавана да прыродных змен. Напрыклад, «Гуканне вясны» адметна выкананнем песень на пагорках, каб мелодыя пералівалася ў паветры, рэхам кацілася да суседзяў і вярталася назад. Перагукванне доўжыцца да вечара. Яго пачатку садзейнічае стан прыроднага асяроддзя: асаблівая чысціня паветра, прастор, эмацыянальны настрой людзей. Вясну завуць у песнях «краснай», што ў народнай мове азначае і прыгажосць (прыгожы) і якасць (найлепшы). Так дзеці сэрцам дакранаюцца да сезонных змен, што напаўняе іх пачуццём светлай радасці, жаданнем захаваць, паспрыяць росквіту. Элементы вяснянак – кветка, вянок – у беларускай народнай традыцыі сімвалізуюць дзявоцтва, чысціню, а таксама аздобу, частку дзявочага ўбору, сродак варажбы. Гэта мае сімвалічны сэнс і выконвае ўласна эстэтычную функцыю. Дзяўчынкі любілі плесці вяночкі з кветак, рабілі ўпрыгожванні: «каралі» з чырвоных ягад рабіны, з гарлачыкаў [2]. Вянок сімвалічна і эстэтычна пазначае асноўную асобу рытуалу, захоўвае абарончы і шлюбны сэнсы. Круг вянка ўвасабляе гаспадарчы севазварот. Значнасць і шырыня сімволікі вянку захавана ў выслоўі – «як у вянку» са значэннем «вельмі добра, хораша» [13, с. 105].

Пачуццё замілавання прыродай, радасці ад яе абуджэння становіцца пабуджальным матывам эстэтычнай творчасці беларуса, якая выліваецца ў форму разнастайных абрадаў, свят. Галоўнае летняе свята – Купалле. Песні ўслаўляюць пару найбольшага росквіту зямных сіл, выражаюць імкненне захаваць ураджай, адлюстроўваюць чалавечыя адносіны. Лічыцца, што раса загойвае раны, трава здольна перамагчы любую хваробу, вада ачысціць цела і душу. Таму распаўсюджаны купанні, абліванні вадой дзеля набыцця прыгажосці і здароўя. У народным свяце ў адзіным коле абрады, песні, гульні, праца, танцы. Такім чынам, штодзённыя клопаты беларуса даюць штуршок да стварэння эстэтычна завершаных і значных твораў. А гэта ў сваю чаргу дае трывалае ўздзеянне на эстэтычнае выхаванне чалавека.

**Вывады.** Традыцыйныя метады народнай педагогікі выкарыстоўваюцца дзеля эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення ў розныя ўзроставыя перыяды.

У пэўным узроставым перыядзе прэвалююць тыя ці іншыя метады эстэтычнага выхавання, скіраваныя на фарміраванне адпаведна непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычных перажыванняў, эстэтычных густаў, ацэнак, арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці. Інакш кажучы, мы бачым прыярытэтную скіраванасць тых ці іншых метадаў у розныя ўзроставыя адрэзкі.

У маленстве (ад нараджэння да 6 – 8 гадоў) галоўнымі паўстаюць метады фарміравання непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці: назіранне, растлумачэнне, перакананне, якія рэалізуюцца праз выкарыстанне калыханак, пацешак, забаўлянак, лічылак. Ва ўзросце «блазнюкоў» з’яўляюцца гульні, прыклад якіх – працоўная дзейнасць і сама праца. Ад 6 – 8 да 12 – 14 гадоў эстэтычае выхаванне

скіравана на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. Дзеці прывучаюцца рабіць усё, крытэрый якасці – прыгажосць. Вядзецца расповед, гутарка, дзеці ўводзяцца ў кола казак, загадак, прымавак і прыказак, гуляюць у гульні, крыніца якіх – працоўны працэс. Падлеткавы ўзрост – ад 12 – 14 да 16 – 17 гадоў аб'ядноўвае папярэдні і наступны перыяды, характаразуецца пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. Умоўныя межы з 16 – 17 да 19 – 20 год – арганізацыя эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая ідзе праз працу, святы, абрады, традыцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 120 с.
2. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мінск: Ураджай, 2000. – 111 с.
3. Сокольчик, В.Н. К вопросу о генезисе эстетических воззрений древних славян / В.Н. Сокольчик // Веснік БДУ. Серыя 3. – 1998. – № 1. – С. 24 – 26.
4. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 1977. – 840 с.
5. Народная педагогіка беларусаў / пад рэд. В.К. Бандарчыка [і інш.]. – Мінск, 1996.
6. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадмова Л.П. Касцюкавец. – Мінск: Беларусь, 1994. – 128 с.
7. У трыдзевятым царстве: беларус. нар. казкі / уклад. У.К. Касько, А.С. Фядосік. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 431 с.
8. Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі / рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 446 с.
9. Гілевіч, Н.С. Паэтыка беларускай народнай загадкі / Н.С. Гілевіч. – Мінск: Выш. шк., 1976. – 126 с.
10. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / склад. Я.М. Рапановіч. – Мінск: Выш. шк., 1974. – 384 с.
11. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах: у 2 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 560 с. – Кн. 1.
12. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах: у 2 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 616 с. – Кн. 2.
13. Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

*Пастуліў 17.06.2010*

## METHODS OF AESTHETIC UPBRINGING IN BELORUSSIAN FOLK PEDAGOGICS (THE END OF 19TH – THE BEGINNING OF 20TH CENTURY)

***S. TUBOLETS***

*The realization of methods of aesthetic upbringing the younger generation (from birth till 20) in Belorussian pedagogics is analyzed.*

*The range of traditional methods of the folk pedagogics (work, observation, game, habituation, retelling, example and authority and so forth ) has the specificity of employment on the grounds of age-long means of upbringing (in the first instance folklore), games, traditions, customs, holidays, rites) in age-dependent periods. In boyhood days through methods of observation, suggestion, explanation, persuasion the formation of immediate sensual reflection of reality takes place. Childhood is distinguished by methods of aesthetic upbringing, which is aimed at the formation of aesthetic experience. By means of methods of work, game, explanation, conversation children accustom themselves to do everything. The factor of quality is beauty. The age of adolescence unites preceding and the following periods, and is characterized by the passage from the formation of aesthetic experience to the organization of practical activities. The juvenility is the time of organization of aesthetically significant practical activities, which take place through work, holidays, rites, traditions.*